*Валянцін Калнін*

## СТАРЫ — НОВЫ МІР

У апошнія два гады мне давялося займацца даследаваннямі італьянскага саду, фальварку пры Мірскім замку і пабудовай плябані пры мірскім касцёле. Частка атрыманых дадзеных дазваляе нанова перагледзець гісторыю ўзнікнення мястэчка.

Мяне заўсёды здзіўляла рэгулярнасць планіроўкі Міра ўнутры абвадной вуліцы Завальнай (цяпер Ленінградская) і колішняя наяўнасць чатырох брамаў па канцах галоўных артэрый. Рысы характэрныя для гарадоў, закладаных у эпоху Адраджэння. Грунтоўнасць планіроўкі Міра XVII ст. праступае ў запісах стольніка П. Талстога з 1697 г.: «Место невелико, а домов изрядного строения много. И стоит тот город зело изрядно». Падобную планіроўку мы бачым у Нясвіжы і ведаем, што такім гэты горад становіцца па загаду Радзівіла Сіроткі ў самым канцы XVI ст.

Што ж было ў Міры? Замак, хоць недабудаваны, ужо існаваў. Менавіта тут, на двары замка, у 1980 г. археолагі раскрылі рэшткі паселішча XV ст., разбуранага моцным пажарам. Знойдзены развал пячы з гаршковай кафляй, кавалкі рэйнскай керамікі, рыжскія манеты, сляды моцнага пажару. У далейшым тэма існавання паселішча на месцы замка не разглядалася.

У 1980-х гг. падчас вызначэння ахоўнай зоны пасёлка Мір археолаг Алесь Краўцэвіч выканаў некалькі раскопаў у цэнтральнай частцы мястэчка. Найбольш раннія знаходкі ў асноўным паходзілі з XVI–XVII стст. У выніку гэтых даследаванняў найбольш даўняя частка паселішча выдзелена каля скрыжавання вуліц Чырвонаармейскай (былой Віленскай) і Першамайскай (былой Слонімскай). Так-

сама аўтарам даследаванняў зроблена выснова, што грунтоўных планіровачных прац, як у Нясвіжы, пры Радзівіле Сіротку ў Міры не праводзілася. Дарэчы, у згаданых нататках пра Мір памылкова пададзена дата атрымання мястэчкам магдэбургскага права (1597 г.). Невядома, ці гэта памылка аўтара, ці памылка зроблена пры наборы тэкста – апошнія дзве лічбы ў даце трэба памяняць месцамі.

Якія ж дакументальныя самыя раннія дадзеныя адносна разбудовы Міра выяўлены на сённяшні дзень?

У 1575 г. дом у Міры атрымаў муляр Марцін Забароўскі, вядомы як будаўнік мірскага і нясвіжскага замкаў. Дату 1575 г. можна лічыць пачаткам перабудовы Мірскага замка ў рэнесансным стылі. Замак у Нясвіжы быў распачаты толькі ў 1582 г. Акрамя таго, у 1579 г. Міру было нададзена права самакіравання. Нясвіж жа атрымаў яго пазней на 7 гадоў. Перабудову Міра згодна з ідэямі Адраджэння трэба аднесці да канца 1570 – пачатку 1580-х гг. Напэўна, горад атрымаў такі выгляд ў 1570-я гг., калі М. К. Радзівіл Сіротка, спадкаемца мірскіх уладанняў, намерваўся заснаваць сваю рэзідэнцыю ў Міры. У рэшце рэшт Сіротка вырашыў уладкавацца ў Нясвіжы, але пакуль там вялася грандыёзная будоўля, у Міры знаходзіўся «штаб» кіравання будаўніцтвам. Захаваліся лісты, дасыланыя з Міра самім князем розным асобам і езуіцкім прадстаўнікам у Рым.

Каля 1600 г. асноўныя пабудовы ў Нясвіжы (замак, калегіум, касцёл і іншыя) былі завершаны. Мірскі замак робіцца запасной рэзідэнцыяй для Нясвіжа.

Акрамя замка другой старажытнай пабудовай мястэчка з'яўляецца касцёл Св. Мікалая. У 1588 г. князь Радзівіл «Сіротка» складае фундушовы акт на Мірскі касцёл і плябань. Сярод запісаў ёсць наступны: «Кожнага году мяшчане мае старога і новага места мірскага згодна старадаўняга звычаю павінны на ўтрыманне плябана пры тым касцёле даваць з кожнага пляца па адным грошу літоўскім». Існаванне двух частак мястэчка зафіксавана таксама ў інвентары Мірскага графства за 1677 г.: «Włoki staromieyskie i nowomieyskie».

Трэба мець на ўвазе, што ў дадзеным інвентары слова «włoki» азначае зямельныя надзелы, а не забудаваную тэрыторыю. Адносна мястэчка ў інвентары пры пералічэнні забудаваных пляцоў узгадваюцца ўсе вуліцы, пачынаючы ад Рынка і па баках ад яго (Аюцавіцкая, Віленская, Высокая, Мінская, Татарская). Толькі адна вуліца, Зазерская, магчыма знаходзілася па правым баку Міранкі, але на ёй тады, у

1677 г., мелася толькі 9 пляцаў. У пазнейшых інвентарах пералічэнне валокаў стара- і новамесцкіх ужо не сустракаецца.

Адзіным прыдатным месцам для пошукаў старога Міра з'яўляецца ўзвышша па правым беразе Міранкі, адразу за замкам. Месца высокае, сухое, пры зліцці ручая і Міранкі, на паўночны захад ад яго — праваслаўныя могілкі (не трэба выносіць нябожчыка праз раку), далей на поўнач пры лесе Воладзерава — мізэр, могілкі іншых даўніх жыхароў Міра — татараў. На плане графства 1830 г. праваслаўныя могілкі (тады ўніяцкія) маюць значны памер. Тое, што на гэтым плане навокал ад фальварка паселішчаў няма, можа сведчыць толькі аб тым, што жыхары старога Міра яшчэ да канца XVII ст. былі цалкам перaселены на новае месца.

Першая вядомая нам дакументальная занатоўка пра мірскі фальварак сустракаецца ў «Spisaniu rzeczy w Skarbcu Mirskim» за 1636 г. Гэта не апісанне пабудоў, а пералік розных рэчаў і жыўнасці па розных месцах, не заўсёды выразна акрэсленых. Напачатку пазначаны рэчы менавіта ў скарбцы па двух скляпах (напэўна замкавых), потым «абора мірская» з наяўнасцю тут быдла рагатага, затым пералічваюцца авечкі, свінні, гусі без удакладнення месца, далей рэчы «у свірне на гумне», коні ў стайні. У канцы спіса рэчы і жыўнасць па іншых фальварках: у Цэтры, Жухавічах, Альбе і Зарэччы пад Нясвіжам.

Вылучыўшы з гэтага спісу фальваркавыя пабудовы ў Міры, атрымаем: абора, хлявы, птушнік, свіран, гумно, стайня. З гэтых пабудоў да нашага часу захавалася гумно, складзенае з каменя і цэглы. Занатоўкі пра яго маюцца амаль ва ўсіх інвентарах. Напрыклад, у інвентары 1688 г.: «Gumno murowane o sochach dwudziestu cztyrech, wrota do niego z podwórza tarciczne dwoiste wielkie (...). Czwarte w końcu od Wielkiego Sioła. (...) Nad temi wrotami w gurze wmurowana sztuka marmuru z napisem». Пераклад на беларускую: «Мураванае гумно на дваццаці чатырох сохах, вароты да яго з двара з дасок падвойныя вялікія (...). Чацвёртыя ў канцы ад Вялікага Сяла. (...) Над тымі варотамі ўверсе ўмураваная мармуровая пліта з надпісам».

У спісе пабудоў фальварка за 1879 г.: «Хлебный сарай камен. (...) год постр. 1600». Удакладненне знаходзім у рукапіснай манаграфіі А. Снежкі: «Urzędnikiem w Mirze za czasów Sierotki był niejaki Andrzej Skorulski, a ciwunem Wasyl Łuczyna. Świadczy o tem tablica granitowa, umieszczona na jednej z obór majęt. mirskich, na której, obok daty wystawienia obory, wyryte i ich nazwiska». Гаспадарчым упраўляючым

у Міры пры Сіротку быў нейкі Анджэй Скарульскі, а цівуном Васіль Лучына. Пра гэта сведчыць гранітная пліта, змешчаная на адной з абор мірскага ўладання, на каторай, разам з датай пабудовы аборы, выразаны і іх прозвішчы». Гэтая пабудова (толькі не абора, а гумно) знаходзіцца на тэрыторыі аўтабазы, шмат разоў перараблялася, мемарыяльнай пліты не захавалася.

Тэрыторыя былога фальварка пры Мірскім замку размешчана на ўсход ад замка на даволі высокім месцы. Адносна тэрыторыі сённяшняга мястэчка розніца вышынь складае каля 20 м. Археалагічныя даследаванні, акрамя замка, тут не праводзіліся. Па дадзеных археалагічных даследаванняў, розніца паміж сённяшняй паверхняй і слоем перад узвядзеннем замка складае звонку ад 0,5 да 1,0 м і дасягае 1,8–2,0 м унутры замкавага двара. Зразумела, што выгіб рэльефу пад замкам у заходні бок — вынік штучнай падсыпкі. Мясцовасць тут была ніжэй цяперашняй, але не на столькі, каб быць залітай у час паводкі. Аналіз агульнага характару рэльефу паказвае, што на месцы замка існавала падвышэнне ў выглядзе мысу каля зліцця двух рэчак: Міранкі і безназоўнай (потым Замкавай). На двары самога замка, як ужо адзначалася, археолагамі раскрыты рэшткі XV ст. Падобных знаходак не было нават у цэнтры мястэчка. Тут зручна было ўладкаваць невялічкае паселішча.

Такім чынам, можна меркаваць, што замак быў закладзены на месцы мірскага двара на пачатку XVI ст. побач з паселішчам Мір. Пры Радзівіле Сіротку на месцы паселішча, празванага тады Старым Местам, паступова фармаваўся фальварак. Новае Места Мір закладзена насупраць замка на левым беразе рэчкі Міранкі. Магчыма, там таксама ўжо існавала нейкае паселішча, але нязначных памераў. Толькі ў адным месцы, у заходняй частцы сённяшняга пасёлка, археолагамі выяўлены пласт, датаваны канцом XIV – XV ст.

Даследаванне па гісторыі развіцця Міра немагчыма праводзіць без аналіза сітуацыі размяшчэння самога замка і навакольнай тэрыторыі. У якасці зыходнай сітуацыі для рэканструкцыі тэрыторыі прыняты стан гэтай тэрыторыі згодна копіі плана Мірскага графства 1830 г. (іл. 1) і тапаграфічнага плана 1930-х гг. (іл. 2).

Пры складанні рэканструкцый асобныя пабудовы ў паселішчах не распрацоўваліся, пазначаны на схемах умоўна. Пры аналізе рэльефу зроблены карэктывы на павышэнне паверхні зямлі падчас будаўніцтва замка на пачатку XVI ст., а таксама пры ўзвядзенні зем-

ляных валоў вакол замка ў канцы XVI – пачатку XVII ст.

Для ўяўлення сітуацыі мною выкананы адноўленыя планы-схемы наваколля замка на XV і на пачатак XVI ст. (іл. 3, 4, 5). Яны могуць быць карыснымі для археолагаў пры правядзенні работ па регенерацыі парка, італьянскага сада і фальварка, плануемыя на бліжэйшую будучыню.